# У новы навучальны год – з новымі кнігамі гродзенскіх пісьменнікаў

Вясёлыя летнія канікулы закончыліся не толькі для вучняў, але і для папулярнай гродзенскай дзіцячай пісьменніцы Ганны Скаржынскай-Савіцкай. З першых вераснёўскіх дзён бібліятэкі, школы і гімназіі запрашаюць яе на творчыя сустрэчы.

Так, 6-га верасня ў рамках Дня беларускай пісьменнасці, які сёлета праходзіў у горадзе Іванаве Брэсцкай вобласці, супрацоўнікі дзіцячай бібліятэкі-філіяла №5 папрасілі Ганну Іосіфаўну расказаць вучням 2-га класа гімназіі №10 г. Гродна пра свята.

Дзеці з захапленнем слухалі госцю, а потым апладысментамі віталі яе новыя вершы, прысвечаныя малой радзіме, таму што ў Год малой радзімы Ганна Іосіфаўна не магла абыйсці гэтую тэму. Шмат твораў яна прысвячае роднай Шчучыншчыне, сваёй любай вёсачцы. Вучні таксама расказвалі пра сваю радзіму, пра тое, як яны разумеюць гэтае паняцце. Шмат іншых твораў прагучала з пісьменніцкай скарбонкі Ганны Іосіфаўны. Падчас сустрэчы пісьменніца пазнаёміла вучняў са сваёй новай казкай "О волшебном путешествии в мир воды", вельмі карыснай і пазнавальнай.

Прыемны сюрпрыз зрабіў усім вучань класа Аляксей – ён прынёс на сустрэчу новую кнігу пісьменніцы, якую хлопчык ужо прачытаў. А зацікаўленым дзецям героі казкі – Вадазнаўца і Чыстая Кропелька – раскажуць пра нашу гродзенскую ваду і той шлях, які яна праходзіць да тае пары, пакуль трапляе ў нашы кватэры. Але дзеля гэтага трэба павандраваць разам з імі па старонках кнігі. Тым больш, што пісьменніца падарыла некалькі экзэмпляраў бібліятэцы.

Вучні з радасцю набылі іншыя кнігі з аўтографам Ганны Іосіфаўны і сфатаграфаваліся з ёю – на добры ўспамін.

**ПРЭС-СЛУЖБА ГАА СПБ**









